Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

**Выходзіць што тыдзень рускімі і лацінскімі літэрамі.**

Адрэс рэдакціі і адміністраціі: **Вільня, Завальная вуліца, д. № 7.**

Цэна з перэсылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к., на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За границай: на 1 г. — 4 р., на 6 мес. —2 р., 3 мес. —1 р. Перамена адрэсу — 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі. Рукапісы і карэспадэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто ея прысылае. Можна такжэ падпісаць проззішчэ разам з фаміліей, хто не захочэ, каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдаціі. Рукапісы аўторам не вертаюцца назад.

Год VII. 5 (18) ліпня (юля) 1912 г. № 27.

*Вільня, 5 (18) ліпня 1912 г.*

Мінскі губэрнатар гэтымі днямі загадаў, каб Гарадзкая Дума, каторая робіць спісок выбаршчыкоў у Гас. Думу ад Мінска, запісывала, да якой націі кожын выбаршчык належыць: да расейцоў, ці да палякоў. Ня першы гэта раз— дый не ў адным Мінску гэтак вядзецца, што ў нашай старонцы ўсё насяленьне дзеляць на расейцоў і палякоў; аб беларусах, адвечных жыхарох гэтай зямлі, не было ніколі ўспаміну: іх бытцым зусім не бачылі... І калі пры выбарах у Трэйцюю Думу гэтак сама дзялілі на дзьве палавіны наш народ, запісаўшы праваслаўных у „расейскую“ курыю, каталікоў—у „польскую“, дык гэта можна было растлумачыць тым, што беларусоў офіціальна не лічылі за асобны народ.

Прайшло ад апошніх выбароў пяць лет, і за гэты час беларусы зрабілі вялікі крок уперад. Усё болей і болей народу падае голас, што яны беларусы; будзіцца ад сну вёска і мястэчка; нарастае новая, національно-сьведомая беларуская інтэлігенція. Справа беларускаго адраджэньня—гэта работа не малой жмені людзей, а вялікае, ўсенароднае дзела І ўжо зусім маўчаць аб беларусах, „не бачыць“ іх—нельга.

Вось чаму у прыказе мінскаго губэрнатара ёсць успамін і аб беларусах: тамака ўжо ясна гаворыцца, *каб беларусоў-католікоў запісывалі „у палякі“, а беларусоў-праваслаўных далучылі да расейцоў*.

Мы не раз і не два тлумачылі, якую крыўду беларусам робіць такі раздзел жывога народу. Цяпер толькі прыпомнім, шмо гэта ёсць работа тутэйшых „патрыотоў“ і „націоналістоў“ с кампаніі Скрынчэнкі, Ковалюка, Солоневіча і т. п., каторые падбіваюць нашых адміністратароў кідаць сілком беларусоў-каталікоў у абоймы польскіх націоналістоў, каб пасьля цягнуць „цёмные“ грошы бытцым-то дзеля абароны тых жэ беларусоў-каталікоў ад... апалячываньня!

Поруч з гэтым нельга не падзяліцца з нашымі чытачамі другой весткай—больш вясёлай. Вось, міністэрство народнай асьветы пастанавіло, каб у гімназіях, поруч з навукай расейскай граматыкі, знаёмілі вучнёў з граматыкай і асобеннасьцямі гутаркі („нарѣчія“) *беларускай і украінскай.* Ведама, дзеля гэтаго патрэбны кніжкі да навукі, але іх ешчэ німа, дык міністэрство аб'явіло конкурс і за найлепшы учэбнік назначыло награду. І цяпер падыймаецца пытаньне, хто возьмецца за такую работу? Ёсць пакуль што толькі адзін вучоны—прафэсар Карскі, каторы ўжо шмат працы палажыў дзеля навучнай разработкі беларускай граматыкі і сваімі трэмя вялікімі томамі („Бѣлоруссы“) палажыў моцны фундамэнт для будучай беларускай філологіі; навучным пазнаньнем беларускай мовы іншые вучоные пачалі займацца нідаўна, і больш ніякіх вялікшых прац аб нашай мове мы не бачым. Выходзіць, што апрача гэтых некалькіх людзей німа каму ўзяцца за пісаньне учэбніка беларускай мовы, і на іх мы ўскладаем сваю надзею, бо толькі праўдзівы, сумленны вучоны, каторы навуку ставіць вышэй, чым палітыку, здалее даць добры учэбнік беларускай мовы.

С пытаньнем аб учэбніку падыймаецца і пытаньне аб навуцы украінскай і беларускай мовы у універсытэтах: бяз гэтаго вучыцелём у гімназіях цяжка будзе споўняць сваю новую павіннасць. І на гэта міністэрство павінно звярнуць асаблівую увагу.

Хаця мы ня думаем, каб тое знаёмства вучнёў 4-го класу з украінскай і беларускай гутаркай было пастаўлена шырэй, усё-ж такі думка міністэрства мае тое значэньне, што прымусіць філологоў звярнуць больш увагі на нашу мову і больш людзей возьмецца да працы над навучнай разработкай яе.

## За апошні тыдзень.

### З Расеі.

Лета ўжо ўсюды запанавало: кінуў сваю работу і Гас. Савет. Кінуў, хаця багата законоў, каторые Дума даўно ўжо зацьвярдзіла, асталіся неразгледжэнымі. Цікава тое, што тые законы, каторые вышлі з Думы у апошніе дні яе жыцьця, як закон аб Холмшчыне, аб ваеннай службе, аб новай асыгноўцы на ваенны флот 503 мільёноў руб., Савет зразу жэ разглядзеў і зацьвярдзіў. Затое такіе важные законы, як закон аб валасным земстве, аб земскім самоўпраўленьні ў Донскай обласьці і Архангельскай губэрні, аб назначэньні, колькі гадзін павінны працаваць прыказчыкі у гандлі, і іншые, хаця іх Дума зацьвярдзіла раней асталіся, як кажуць, пад сукном.

Ва ўсім гэтым поступовые газэты бачаць „палітыку“: Гас. Савет аказаўся больш „правым“, чым Дума, і глядзеў на думскіе законы, як на лішне „левые“. Вось ён і пастанавіў адлажыць да Чацьвёртай Думы, бо мае надзею, што яна лягчэй прыстане на пераробкі і папраўкі Савета. Надзею гэта дае Савету тое, што сёлета за выбары ўзяліся востра сьвяшчэнікі па загаду Сыноду: у іншых губэрнях архірэі абвесьцілі, што будуць караць сьвяшчэнікоў, каторые не паедуць на выбары. Ужо цяпер кажуць, што калі работа гэта пойдзе акуратна, дык можна спадзявацца ў Чацьвёртай Думе больш сотні дэпутатоў-сьвяшчэнікоў.

Рэвізія у Бодайбо сэнатара Манухіна неяк дагэтуль не зрабіла парадку і не завела тых перамен, без катарых рабочые ў ленскіх капальнях ня хочуць працаваць. Праўда, гаспадары капальнёў прыстаюць на тое, каб у дагаворах з рабочымі зрабіць некаторые перамены, але с тым, каб новые кантракты былі напісаны да 1 верэсьня 1913 году; а рабочые на гэта сваей згоды не даюць, бо калі скончыцца сіла кантрактоў у сенцябры, дык ў тым часі німа як выехаць з Бодайбо: восень у Сыбіры вельмі дрэнная, і дарогі німа. Апрача таго гаспадары хочуць каб рабочые падпісаліся, што па старых кантрактах на суд гаспадароў пазываць ня будуць. Вось рабочые і маняцца ўсе разам і не чэкаючы канца рэвізіі выехаць з Бодайбо; яны нездаволены, што дагэтуль дзержаць у вастрозі іх дэпутатоў, каторых арэштавалі ешчэ перад разстрэлам.

З Одэссы пішуць, што тамака ізноў аддалі пад суд 18 інтэндантоў, ў тым ліку аднаго палкоўніка, трох падпалкоўнікоў і іншых. Паступовые газэты, кажучы аб гэтым, прыпамінаюць словы дэпутатоў, каторые, калі у Думе ішла гутарка об асыгноўцы 502 мільёноў руб. на новы флот, даводзілі, што гаспадарка казённым дабром скрозь дрэнна нарыхтавана, і радзілі Думе грошы не даваць.

### З заграніцы.

Як мы ўжо пісалі, у Турэччыне з дня на дзень чэкалі новай рэволюціі, каторую маніліся падняць афіцэры, нездаволеные палітыкай цяперашніх загадчыкоў гасударственнаго жыцьця. Але ўсё неяк зразу супакоілося: туркі паказалі, што грамадзянская сьведомасць у іх стаіць так высока, як ніхто ня думаў. Перш на-перш, убачыўшы нездавольства народу, падаўся ў адстаўку ваенны міністэр і вышэйшые ваенные чыны. Поруч з гэтым і афіцэры, што падгатаўлялі паўстаньне, абвесьцілі, што яны будуць сядзець спакойна, бо пакуль ідзе вайна з італьянцамі ўсе туркі павінны забыцца аб сваіх крыўдах, кінуць хатніе сваркі і ісьці проці ворагоў сваей бацькоўшчыны, не шкадуючы жыцьця свайго.

У тым жэ часі не кідаюць проб вярнуць трон скінутаму каралю яго прыяцелі у Португаліі. Маючы багата грошы, яны кантрабандай прывозяць з-заграніцы аружжэ, збіраюць гурткі з людзей вышэйшых станоў і нападаюць на тые гарады, дзе менш войска, вернаго народнаму правіцельству. Але гэта ім не удаецца: іх усё разбіваюць.

Новую завіруху ў Кітаі можэ выклікаць здарэньне, каторае прылучылося гэтымі днямі. У вёсцы Чына, недалёка ад Расейскай граніцы, народ напаў на адзін дом, дзе было больш сотні расейцоў, і шмат пазабіваў. С чаго гэта пай-

## Думы ў чужыне.

Горэ мне цяжкае, горэ безсчаснаму!
Сэрцэ ўсё жаліцца, плачэ, баліць.
Хочэцца к сонейку цёпламу, яснаму:
— Хоць бы убачыць!— Ўсю цягасьць зваліць.

Доля мая, што мяне узбагаціла,
— Думак, жаданёў і сэрцэ дала,
Недзе гама́н з маім шчасьцем утраціла,
З горэм падняла і мне падала.

---

Што там на перэдзі, што там незнанае,
Што там са сдзекам мяне, сьцеражэ?
— Скрытна-варожжае, з страхам чэканае,
Можэ і блізка на нейкай мяжэ.—

Толькі не сьмерць,—не аб ёй няспакоюся;
Сьмерць гэта што! Гэта дар для усіх.
Прыйдзе то час і я з ёй заспакоюся
Збыўшыся болёў і думак сваіх.

Іншае горэ душу абціжарыло,
(Камень цяжэйшы на сэрцы ляжыць).
Дні майго разквіту мглою абдарыло,
Ў жыцьці што дзенне за мною бяжыць.

— Доля мая, гэта доля гаротная,
Сэрцэ мне дало, наўчыло любіць
Дый прысудзіла яна-ж адваротная
Век у сіроцтве, ў выгнаньню пражыць.

Што мне жыцьцё, хоць бы самае краснае?
— Волі німаю! Ў няволі жыву.
Гэтае нуднае быцьце уласнае
Сьмерцьцю страшэннаю з болем заву.

Сокалам вольным і з пташшай гульлівасьцю
Як бы здаецца адсюль паляцеў...
Нельга і думаці,—доля бяз міласьці
Варту паставіла. Вораг абсеў.

---

Беднасць—ня горэ саўсім мне безскарбнаму.
Я багацей, замажней, за другіх.
І ні зайздрошчу багацтву тых марнаму
Досіць з мяне бедных злыднёў маіх.

Покі варушацца рукі скарэлые,
Праца мне будзе, на радасць на сьмех.
Злотам багатые, сэрцам знішчэлые,
Трутні ня мецьмуць гэткіх уцех.

Што мне багацтво? Бяз грошы, бяз золата,
Быў-бы магнат я, кароль, багатыр,
Там, дзе пад націскам роднаго молата
Жыцьце куецца у глыб і у шыр.

Жыцьце куецца і сонцэ ўздымаецца,
Сьвету праменьня ліецць з гарыні,
З доўгаго сну дзе народ прачыхаецца,
Побыту шчаснаго сьвецяць агні.

Там, дзе цяпер ешчэ сілы нячыстые
Жыцьце карэжаць, па свойму вядуць.
Дзе ўстрэпбнулісь дубы густалістые
І на курганах нямоўчна гудуць.

Можэ і я з сваёй слабаю сілаю
Там працаваці-бы крышку памог;
З гэтаю працаю шчыраю, мілаю,
Сьмерці спаткаў бы спакойна парог.

Можэ... А можэ не ўбачыці гэтаго?
Можэ суджона тут век мне пражыць?
Дні адзіноты, сіроцтва без сьветнаго,
Грудай каменьняў ў душэ валачыцца.

---

Страшна мне гэта і ўсё-ж не ядынае
Так паваліласся, гняце ў шыбіне.
— Ёсць жэ горшая мука—што сынам я
Быць перэстану сваей старане.

— Памяць ня доўгая, любасць ня вечная;
Сырасць, безлюднасць,—іх трудна нясьці;

прасунуці; вечна ён посціп, ўсяго баіцца, перад кожным шапку знімае і нізка кланяецца, а калі здарыцца ў яго цяжкае горэ, то на Бога нарэкае, і чухае патыліцу і залівае сваю бяду манапалькаю. А манаполька, як пакуса, ў кожнай вёсцы у баб прадаецца. А захварэе, барані Божэ, ў хаці, хто-колечы, то клічуць знахара, шэптуна, бо дохтара ці хвейчэра і з лучынаю, як кажуць, не знайдзеш: на дзьве воласьці адзін хвейчэр, а ў казённай аптэцы, што стаіць у воласьці, усяго знайдзецца на 20 тысяч населеня фунт рыціны, унція хіны, трохі соды і ешчэ чагось. Ня дзіва, што наш цёмны беларус звертаецца да знахароў. Гэтак колькі дзён таму назад ў аднэй бабы в. Гошэва Кобрынскаго павету захварэло дзіця. Баба, ня доўга думаючы, паехала да знахара ў вёску Жабэр. Знахар быў добры чмут і зумеў бабу адурыць і кажэ: „Земля, мая ты галубка, трэбуе дані і нічога не парадзіш, трэба ей даці, бо ўжо даўно яна брала тое, што ей прыналежыць“. Баба спалохалася і стала прасіць знахара памагчы гору, а знахар сваё кажэ. У беднай бабы душа, як кажуць, ў пяткі улезла, халодны пот закапаў па твары, ў вачу сталі слёзы. „Ратуй, дядзюхна! застагнала баба, і тыц яму ў руку тры рублі і пляшку гарэлкі. Знахар памарматаў, пашэптаў і кажэ: „Зрабі нябога дамавіну дзіцяці“. Ад гэтых слоў баба загаласіла. „Цыт, кажэ знахар. У гэту дамавіну палажы асоваго кала і закапай на магіліцах. Прыйшоўшы да хаты, скліч людзей, суседоў і выдай баль, як на вясельлю, нічога не шкадуй і ніхай людзі пьюць і ядуць“. Баба гэтак і зрабіла, аддала на гарэлку апошніе грошы, напекла мяса і зрабіла баль. Сабраліся суседзі, папілі і паелі ў ахвоту. Ведама, хто адкажэцца ад дармоваго пачастунку. На другі дзень пастушкі угледзілі сьвежу магілу і адзін з іх прасунуў кіём яе. Кій на дзьве пядзі прасунуўся ў сьвежу зямлю і стукнуў ў века дамавіны. Цікавые пастушкі, нічога не кажучы, рукамі адграблі пясок, дасталі дамовіну адкрылі яе і за месцэ трупа дасталі з труны асоваго калочка.

Вось ў нашых вёсках якая цемната.

Калі ты наша Беларусь ўваскрэсьнеш, калі цябе асвеціць яснае сонейко навукі, калі ты разарвеш тые ланцугі, каторые многа лет дзержаць цябе ў цемнаце. Я хаця стары чэлавек, але не трачу надзеі, што на нашай сьвятой Беларусі загарыць ясным полымем навука, што сьвет ва ўсе цёмные куты загляне і прабудзіць беларусоў ад доўгаго сна. Нам толькі трэба больш школ і навуку на нашай беларускай мове, бо расейская мова, хаця і культурная, але для нас малазразумелая і дзеля гэтаго сельскіе грамацеі не ахвотна чытаюць расейскіе кнігі. Кожная нація любіць сваю мову, свае обычаі і сваю бацькоўшчыну.

*Верны сын Беларусі*
*стары дзьед Міхась*

**Магілеў** (губ.). Ў сяле Барсуках, за 18 вёрст ад Магілева, чатыры невядомые разбойнікі забілі сьвяшчэніка Ноўскаго. Прычыны душагубства загадковые. Разбойнікі нічога не ўзялі, а зараз жэ паўцекалі.

М. **Ляды**, Могілеўск. губ. горэцк. пав. Сёлета у нашым мястэчку „працуе“ варажбіт хіромант (што з рукі варожыць). Усім і кожнаму ён суліць доўгае жыцьцё, шчасьце і багацтва, ведаючы прыказку: „абецанка - цацанка, а дурному „радасць“. І з гэтай радасьці дурные людзі сыплюць і сыплюць яму у грамадны кішэнь свае гаротные медзякі.

О, Беларусь, калі ты адумаешся, пасьвятлееш, калі недапусьціш розным ашуканцам здзекавацца над сабой?

*Саўка К—ль.*

## З усіх старон.

**Пецербург**. Правіцельство у цыркуляры да губэрнатароў загадало прыскорыць работу з выборчымі спіскамі і каб гэту работу скончыць да 8 жніўня (аўгуста). Праект, каб склікаць Думу у студні (январэ) сустрэў супраціўніка ў асобе першаго міністра. Глаўным пунктам правіцельственнай праграмы у Чацьвёртай Думе будзе праект закону каб аблажынь усіх падаходным падаткам.

= Пецербурскіе газэты пішуць, што 15 жніўня выйдзе наказ аб роспуску Трэйцяй Думы. Між 15 верэсьня і 1 кастрычніка адбудуцца выбары ад селян і упоўнамочэных ад дробных і сярэдніх землеўласьнікоў. Між 15 і 25 кастрычніка (окцябра) пачнуцца выбары у гарадох і па другіх курыях. Аткрыецца Чацьвёртая Дума 12 лістапада (наябра) Работы у Думе пачнуцца 1 сьнежня (дзекабра).

**Курск** Курскі губэрнатар забараніў почці прыймаць для перасылкі падпішчыкам паступовые (прогрэсіўные) газэты. Што край, то абычай.

**Одэса**. Папечыцель школьнаго округа Шчэрбаков хацеў завясьці роты „пацешных“ дзеўчат з вучэніц мейсцовых школ, але начальство у Пецербурзе ня згодзілося на гэто, лічучы не патрэбным збольшываць ваенны дух у жанок.

**Севастопаль**. У ваенна марскім судзе пачалі разбіраць справу 16 матросоў броненосца „Іван Златауст“, абвінавачэных за падбіваньне матросоў да паўстаньня. Справа разбіраецца пры зачыненых дзьверах і працягнецца колькі дзён. Будынак суда пільнуе войско і паліція.

**Армавір**. Паведамляюць, што на будоўлі армавір-туапсінскай чугункі забаставалі работнікі. Прычына забастоўкі тая, што работнікам два месяцы не плацілі заработкоў. Заместа грошы ім выдавалі квіткі у крамы падрадчыка, дзе работнікам накідалі цэну на тавары. Верхаводоў арэштавалі, не зважаючы на тое, што начальство прызнало вымаганьня работнікоў справядлівымі.

**Бодайбо**. На ленскіх капальнях гаспадары капалень напісалі умову для работнікоў, работнікі адмовіліся падпісаць яе бо ня згодзіліся на разцэнку за работу. Ізноў апавесьцілі забастоўку, работнікі прыпынілі работу.

## Агляд кніг.

### Выйшлі з друку новые беларускіе кнігі:

**Зборнік „Нашай Нівы № 1.** Вільня 2912 г. 80 стр. ц. 15 к. У зборнік увайшло 10 апаведаньнёў: Тарас Гушча: Старасць—не радасць; К. Лейко: Кульгавы дзядзька Раман; М. Арол: Дзьве дарогі (з Белінскаго); Галубок: Кручэная авечка (перэклад з украінскаго); Олехновіч-Чэркас: Сусьветны жаніх; Хвэлька з Івенца: Думкі; Зьмітрок Бядуля: Тулягі; Ядвігін Ш.: Раны, Дачэсные; Янук Журба: Прыгонная душа.

**Гальяш Леўчык: Чыжык Беларускі**. (Зборнік вершоў). С партрэтам аўтора, 48 стр. цэна 30 кап. Вільня 1912 г. Акладка з рысункам аўтора.

**Беларускіе казкі**: Багатыр; Чэлавечае вока; Ведзьмар; Сямілетка; Вада памагла; Хаўрус; Куча грошы. 32 стр. з рыс. ц. 5 к. Вільня 1912 г.

**Хілібэртава пакута**, Верба, Палятуха. З Амфітэатрова, вольны перэклад В. Л. 32 стр. ц. 5 кап. Вільня 1912 г.

**Беларускіе песьні з нотамі II**, сабраные А. Грыневічэм і А. Зязюляй. 32 стр. ц. 25 к. Пецербург 1912 г. Выданьне А. Грыневіча.

## Жарты.

**Сустрэча старцоў.**

— Як маешся, дзед Панас?
— А, здаро—здароў, брат Аўлас!
— Ну што, ці ажаніўся там ваш Тарас?
— О, жаніўся—жаніўся, даўно жаніўся!
— А з якога калена ён сабе жонку узяў, ці з нашаго брата, ці з мужыкоў?...
— Ды нашага—з нашага—стараставу дачку Параску узяў!
— А-а-а!... Вун яно што!...
І вялікі пасаг узяў?
— О, вялікі—вялікі: хатыль новы шасьцінітовы, на дзьве палавіны; шлеі строчэные, вышываные; барабалкі точэные, малеваные!
— А-а-а! Бачыш—бачыш!
- Кастыль новы вязовы, насеканы з закаклюкай!...
— А-а-а!
— А на канцы пуга—ўся ў вузлах, як неба ў зьвездах!...
— А-а-а!
— Як жагне пад хвост сабаку, дык на дзесятым дварэ гаўкне!...
— Ого-го!...

Рэдактар-Выдавец
**А. Ўласоў.**

**Чародны нумэр выйдзе 19 ліпня с прыдаткам—кніжкай для падпішчыкоў.**

Усе загранічные (ва ўсіх гасударствах Заходнай Эўропы і ў Паўночнай Амэрыцы) пачтовые канторы прыймаюць падпіску на „Нашу Ніву“ і самі дбаюць аб тым, каб газэта даходзіла акуратна. Дзеля гэтаго радзім нашым загранічным падпішчыкам не турбавацца с перасылкай грошы, а плаціць падпіску за „Нашу Ніву“ у сябе на почці.

ТЫЕ, КАТОРЫЕ ПАСТАНАВІЛІ ЗАСТРАХАВАЦЦА, НІХАЙ ЗВЕРНУЦЦА Ў

**Першае Узаемнае Таварыство Страхаваньня Жыцьця 1902 г.**

дзеля таго, што аснаўною думкай організатароў гэтаго чыста ўзаемнаго Таварыства было **зрабіць страхаваньне жыцьця агульнадаступным**, спадзеючыся, што **страхавацелі самі патрапяць раздзяліць свае ашчаднасьці між сабой і абойдуцца без дарагіх услуг акційных кампаній**.

Беручы пад увагу гэткую сур'ёзную і важную мэту „**Першаго ўзаемнаго Т—ва Страхаваньня Жыцьця**“, пры апрацаваньні уставы, варункоў страхаваньня і тарыфоў была звернена асаблівая увага на тое, каб, не нарушыўшы асноў устойчывасьці і моцы Т—ва і **не вымагаючы** пры тым **кругавой парукі** ад členoў Таварыства, **захаваць поўную ўзаемнасць і даць** членам Таварыства **найбольшые льготы**, якіх толькі можна дабіцца ў дзеле страхоўкі жыцьця.

Вынікам гэтаго кірунку сталіся **аснаўные льготы** страхавацелёў „Першаго Ўзаемнаго Т—ва Страхаваньня Жыцьця“.

Ўсе страхавацелі ёсць **праўдзівые члены** Т—ва, каторым устава Т—ва і полісные варункі заручаюць:

1) **Поўную ўзаемнасць** без кругавой парукі (атвецтвенасьці членоў), а іменна: учасьце у агульных сабраньнях, ў выбарах с паміж сябе Праўленьня і Рэвізійнай Камісіі, с правам быць выбраным, ў зацьверджэньні тарыфоў, сьмет і атчотоў, ў раздзеле даходоў і др.
2) **Самые танные прэміі з учасьцем** усіх страхавацелёў **ў даходах**;
3) **Самые льготные варункі разсрочкі** аплаты премій:
4) **Поўную свабоду** падарожы і заняцьця.
5) **Нетыкальнасць і бязспорнасць** полісоў;
6) **Найвышэйшая сумма выкупа** на выпадак перадтэрміновай астаноўкі страхаваньня, права **прыастаноўкі і аднаўленьня страхаваньня**.
7) Спэціальные **пазычкі для выплаты прэмій**;
8) **Выкупные і рэдукціраванные суммы**—вышэй другіх і **наказываюцца** ў полісах.

**Упраўленьне Літоўска-Беларускаго Округа.**
Вільня, Георгіеўскі праспэкт 4. — Тэлефон № 830.

**Патрэбны рупные агенты.**

**„САХА“**

**Першы беларускі месячнік сельскай гаспадаркі**

«САХА» дае практычные рады па ўсіх аддзелах сельскай гаспадаркі, дастасаваные да нашых варункоў і клімату

**ПАДПІСНАЯ ЦЭНА:**

На 1 год . . . . . 1 руб. 20 кап.
на 6 месяцеў . . . — » 60 »

Цэна асобнаго нумэру 8 кап., з дастаўкай да хаты 10 кап.

**Пробны нумэр высылаецца дарма.**

*Адрэс рэдакціі: Вільня, Завальная 7.*—Рэдактар-выдавец **А. Ўласоў.**

Друкарня Марціна Кухты, Татарская, д. № 20.